Маціеўскі, М. Так мала яму зязюля накукавала… / М. Маціеўскі // Чырвоны прамень (Чашнікі). — 1995. — 18 лют. — С. 2.

ТАК МАЛА ЯМУ ЗЯЗЮЛЯ НАКУКАВАЛА…

Снится мне ночами дом родной
И в рябинах тихая опушка,
Тридцать, девяносто, сто...
Что-то расщедрилась кукушка.

Іх шасцёра нашых хлопцаў-землякоў, якія загінулі ў жорсткай вайне ў Афганістане. Пра пецярых наша газета змяшчала ўжо ў свой час нарысы памяці. А вось пра Алега Дуброўскага з Тарасак у раёнцы толькі напісалі тады, што ён пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалём «Воіну-інтэрнацыяналісту ад удзячнага афганскага народа». І ўсё. Вельмі мала было звестак аб службе земляка, аб тым, якім чынам ён загінуў. І ўсё ж хоць са спазненнем, і дзякуючы карпатлівай пошукавай рабоце супрацоўнікаў райваенкамата, членаў раённай асацыяцыі воінаў-інтэрнацыяналістаў мы маем сёння магчымасць прадаставіць увазе чытачоў нарыс памяці пра Алега Дуброўскага, мужнага, адважнага воіна-інтэрнацыяналіста.

Заўчасная смерць заўсёды жорсткая і не справядлівая. Быў чалавек – і няма. Змірыцца з гэтым цяжка.

…Цынкавую труну адкрываць забаранялі, як Вера Фёдараўна і Анатоль Аляксандравіч ні прасілі аб гэтым. Маці ў роспачы, знемагаючы ад гора, прыпала ўсім целам да халоднага металу, абшчапла труну рукамі і наўзрыд загаласіла.

На грамадскіх могілках узвышаецца вайсковы абеліск. Дуброўскі Алег Анатольевіч, – высечана на граніце. І дзве даты: ліпень 1965 – студзень 1985 г.

– За што, даражэнькі сынок мой, за што ты лёг у зямельку – галасіла маці, у бясконцы раз, прыпадаючы да дарагога астраўка зямлі.

– За што? – падымала яна на нас выплаканыя, змучамыя тугой вочы.

Маўчым. Не ведаем што адказаць ёй.

– Адпачыць не паспеў перад арміяй. – цішэе, сушыць, не можа высушыць насоўкай вочы Вера Фёдараўна Дуброўская. – Да апошняга дня, пакуль не атрымалі позву, працаваў. А ўручылі – праз тры дні і пайшоў. Праўда, провады паспелі зрабіць. усіх сяброў сабраў Алег у хату. Весяліліся, наказы давалі.

А праз год, студзеньскім днём 1985 года горш, чым ад самага лютага марозу прыцішыліся ад горкай весткі Тараскі, суседнія вёскі – вайскоўцы прывезлі хаваць Алега Дуброўскага.

Ён вельмі любіў тэхніку. Таму і ў прафтэхвучылішча пасля школы пайшоў. У інтэрнаце жыць не хацеў. Штодня, нават зімой, прыязджаў дадому. І тады, як і ў школе, цягнуліся да яго сябры. Заусёды молада, светла, весела было ў хаце Дуброўскіх.

– А як жа яму матацыкла хацелася, – успамінае бацька Анатоль Аляксандравіч. – Прыйду з работьг, а Алег да мяне лашчыцца. І гаворка ў яго адна – пра матацыкл. Навошта ён табе, сын, – адгаворваў. – Адслужыш у арміі – мы табе машыну купім. Не купілі.

– Як прыслаў Алег першае пісьмо з Афганістана, дык і не ласкавым для нас стала сонейка, а потым і зусім закацілася, – зноў душаць слёзы Веру Фёдараўну. – Душой бяду чулі. Не знаходзіла сабе месца. Прыду з работы напрацаваная, а заснуць не магу. Усё здаецца, што хтосьці стукае, кліча, кліча. Сэрца, відаць, маё да яго рвалася. Не даляцела. Не дапамагла. Не ўберагла. І цяпер спакою аніякага. Дні – як пад хмарамі. Ноч – не збыць. Кідаешся, з боку на бок, прасцінку ў вяроўку скруціш. Прысніся хоць, Алежанька, Бога малю. Ды не бачу ніколі выяўна. Усё ён у паўзмроку.

А ён пісаў такія пяшчотныя, супакойваючыя пісьмы. **«Дарагія мама і тата. У мяне ўсё добра, здароўе выдатнае. І кормядь выдатна. За мяне не хвалюйцеся. Галоўнае – беражыце сябе...».**

«...Не хвалюйцеся, пакуль у баях не ўдзельнічаем. Цэлымі днямі даводзіцца праводзіць у танкавым парку. Надакучыла. Пачаў аж лянець. А як вы там, мае родыня? Я вельмі люблю вас. Да хуткай сустрэчы...».

А іх танкі заўсёды знаходзіліся на пярэдніх пазіцыях. Аўтару гэтых радкоў давялося пазнаёміцца з артыкулам з вайсковай газеты, у якім пішацца пра апошні бой нашага земляка. Пераказваю яго змест.

У той дзень 1985 года савецкія і афганскія падраздзяленні вялі жорсткія баі з бандамі ў даліне Вардак. Мотастралковае падраздзяленне, у якім служыў танкіст Алег Дуброўскі, трапіла ў засаду. Вораг пачаў абстрэльваць машыны з гранатамётаў. Баявым машынам неабходна было ўкрыцца за згібам дарогі. Ды калона амаль спынілася. Уздоўж трасы гарэлі нашы «Уралы» з палівам, з узарванага ў некалькіх месцах трубаправода біў вогненны струмень паліва. Полымя з гулам вырывалася ўверх метраў на трыццаць, нават скалы, здавалася, гарэлі. Трасу намёртва закрылі падбітыя наліўнікі. І галоўная небяспека цяпер не толькі ў душманскіх гртах. У гэтай вогненнай барыкадзе. У што б там ні стала, яе неабходна было прабіць.

– Расчышчаць дарогу прамой наводкай! – загадаў камандзіру галаўнога танка, у экіпажы яго быў і наводчык Алег Дуброўскі.

Лязнуўшы гусеніцамі, танк марудна крануўся да пылаючага затору, і ствол яго гарматы нацэліўся прама ў цэнтр полымя. Адзін залп. Другі. Уверх узвілася і амаль адразу ж апала сцяна равучага полымя, апаліўшы гарачынёй калону.

У тым баі нашы воіны перамаглі. А вось для Алега Дуброўскага ён быў апошні. Іх галаўны танк падарваўся на міне. Увесь экіпаж загінуў. Затое засталіся жывымі астатнія баявыя таварышы – напарадзе ў калоне пайшлі сапёры…

Якім быў Алег Дуброўскі? Што ён паспеў здзейсніць у кароткім сваім жыцці? Гэтыя пытанні мы задавалі не толькі яго бацькам, але і многім іншым людзям, хто ведаў яго. Усе сыходзіліся на адным: цудоўны хлопец! Гэта падцвярджаюць радкі характарыстыкі, дасланай ў раённы ваенны камісарыят з Лепельскага прафтэхвучылішча:

«А. Дуброўскі вельмі таварыскі, чулы, уважлівы. Заўсёды вызначаўся стараннем у працы. Быў актыўным у грамадскім жыцці…».

З вайсковай характарыстыкі:

«Радавы А. Дуброўскі па прыбыццю ў часць хутка ўвайшоў у калектыў, сваёй бездакорнай дысцыплінай і старанасцю заваяваў павагу камандзіраў. Спасцігаў на занятках тонкасці танкісцкай справы і лепш за многіх саслужыўцаў асвоіў яе, а ў час, які адводзіўся на добраўпарадкаванне салдацкага побыту, паказаў свае залатыя рукі...

У баі быў заўсёды смелым, адважным, кемлівым...»

Быў. Якое слова. Яго равеснікам сёння па 30. Яны кахаюць, гадуюць дзяцей, мараць, працуюць, жывуць. Алег назаўсёды застаўся 20-гадовым. Без яго цвітуць сады і ападаюць яблыкі. Без яго гуляюць вяселлі, будуюць жыллё. Балюча і горка ўсведамляць гэта.

Время выбрало нас,

Закружила в афганской метели.

Нас позвали друзья в грозный час –

Мы особую форму надели.

На змучаных кулямі і асколкамі афганскіх вышынях, пры абароне мірных кішлакоў, ахове грузаў з хлебам праявіліся лепшыя рысы нашых маладых сучаснікаў, салдат і афіцэраў. Смеласць, гераізм, высокія пачуцці абавязку і таварыскасці.

Мы так верылі, што гэта вайна будзе для нас апошняй... Але не… Таджыкістан, Арменія, Азербайджан. Сёння вось Чачня. Што з намі робіцца, людзі?

Навекі дваццацігадовым застанецца Алег Дуброўскі. Як мала яму накукавала зязюля.

М. Маціеўскі, афіцэр